Oplatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАРОДНАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 38 Вільня, Субота, 27-га лістапада 1926 г. Год I

Атручаныя плады.

Гісторыя сярэдніх вякоў і пачатку новых дала страшэнна панурыя прыклады таго, куды вядзе народы ўлада фанатычнага, завіснага аб свае ўплывы на душы людзкія кліру. Сколькі крыві бязьвінна праліла „сьвятая інквізіцыя“, сколькі войн узьнімалася паміж народамі і грамадзянамі аднаго краю — толькі затым, што адны вызнавалі адну рэлігію, другія—другую, і тая ці іншая царква старалася гвалтам прымушаць людзей падчыніцца яе ўплывам і прызнаць яе „неабмыльнасьць“!...

Польшча афіцыяльна пахваляецца сваей колішняй „толеранцыяй“ і „пашанай“ да ўсіх вызнаньняў. Але-ж вось надовячы ўрадовы „Kur. Wil.“—ў сувязі з выстаўкай у Вільні памятак рэфармацкага руху ў нашым краю — рысаваў нам жудасныя сцэны пагромаў кальвінскіх збораў і паленьня кніг, праціўных каталіцтву... А гісторыя змаганьня каталіцтва з праваслаўнай царквой у Беларусі—ў XVI і XVII сталецьцях? А працэсы „адступнікаў“ і спаленьне на агні графа Патоцкага, які адрокся ад каталіцтва і прыняў жыдоўскую веру?!

Так, рэлігійная „толеранцыя“ была ў старой Польшчы запраўды-ж нейкая асаблівая. Дый сучаснаму пакаленьню яна пераказала ня менш жудасную спадчыну.

Праўда, на паперы—ў Канстытуцыі—Польшча вельмі „толерантная“ да ўсіх вер. Арт. 111 Канстытуцыі забясьпечывае ўсім „свабоду сумленьня і вызнаньня“, арт. 114 кажа аб роўных правох усіх рэлігіяў, арт. 116 загадывае ўладам „не адмаўляць“ прызнаньня тым рэлігійным саюзам, якія не пагражаюць публічнай бясьпечнасьці.... А на дзеле?!

Ня будзем тут успамінаць адносінаў польскае ўлады да праваслаўнае царквы: іх добра памятаюць усе праваслаўныя беларусы... Зьвернем увагу на найнавейшыя факты панаваньня ў Польшчы каталіцкага кліру і таго атручываючага ўплыву, які гэны клір аказвае на польскія масы.

Як падае „Głos Prawdy“, у Варшаве надовячы адбылася запраўды-ж дзікая і бяспрыкладная ў культурным сьвеце гісторыя. Туды прыехаў біскуп Польскае Нацыянальнае Царквы з Амэрыкі, Годур, і меўся чытаць публічную лекцыю. Калі Годур узышоў на трыбуну, дык грамада сфанатызаваных студэнтаў-каталікаў, „пад‘юджаная адным з варшаўскіх дзеячоў“, з палкамі напала на біскупа і дапаўсьмерці зьбіла яго і яшчэ другога прадстаўніка Нацыянальнае Царквы. Адзіны прысутны ў салі паліцыянт, ведама, ня мог бандытам перашкодзіць у іх ліхім дзеле...

І гэта—не адзіны ня выключны выпадак выяўленьня дзікога фанатызму, узгадаванага ня толькі ў цёмных масах Польшчы каталіцкім клірам. У выдаваным у Варшаве месячніку „Wolna Myśl“ знаходзім цэлую жменю варожых да польскіх сэктантаў выступленьняў ня толькі з боку цёмнае таўпы, але і з боку прадстаўнікоў улады... Вось гэтыя факты.

„14 жніўня с. г. акружны суд у Кракаве сканфіскаваў і зьнішчыў цэлы наклад часопісі: „Адраджоная Польшча“ №16 за стацьцю „Чэсьць Марыі, чэсьць і хвала“, у якой суд бачыць асьмеіваньне навукі каталіцкага касьцелу аб „збаўленьні і аб сьвятых“. Япіскап Кавальскі (—пасьля сьмерці „матэчкі“ Казлоўскай галава сэкты Мар‘явітаў) быў засуджаны ў Плоцку на 1 год крэпасьці за заяву, што „касьцельная гіерархія — гэта труп і гнільлё“. Апэляцыйны суд зьменшыў кару на 6 месяцаў. Пад‘юджаныя каталіцкім клірам пастарунковыя Краўз і Войташэк з Ясткавіц цяжка пабілі членаў Нацыянальнае Царквы Белецкага і Сматука, напаўшы на іх уначы. У Грудзёндзу павятовы суд засудзіў кс. Гайдука, кіраўніка гміны Нацыянальнае Царквы, на 4 тыдні турмы за „зьнявагу“ каталіцкага касьцёлу. А два заядлыя абаронцы каталіцызму—знамянітыя на пазнанскім бруку пагромшчыкі Сэкрэтарчык і Каронка,—ўварваліся ў часе набажэнства ў памешканьне сэкты дасьледчыкаў „Сьвятога Пісьма“ і сілай выгналі членаў сэкты, прычым іх крэпка зьбілі палкамі“.

Не дарма-ж навет заўсёды такі ўгадовы „Robotnik“ бярэ голас у справе распаношыўшагася ў Польшчы клерыкалізму. „Шмат ёсьць у нашай Канстытуцыі пекных рэчаў, ды толькі яны—дзеля сьвята, дзеля пекных гутарак і... заграніцы“. Апе „клерыкалізм стараецца шляхам дакананых фактаў зьніштожыць у дэмакратычным жыцьці Польшчы загады Канстытуцыі“. Абураецца і орган ваеннага міністэрства „Polska Zbrojna“ — перадусім „на тых, хто пад‘юджае да гэткіх подлых выступленьняў, як апошнія“...

Але-ж маральныя вінавайцы гэткіх учынкаў так прывыклі лічыць сябе „неабмыльнымі“, так высока пастаўлены ў грамадзкім жыцьці акурат дзяржаўнай уладай — дзякуючы канкардату з Рымам, што на ўсе пратэсты дэмакратычнае прэсы не зварачаюць ніякае ўвагі. І так яно будзе датуль, пакуль у Польшчы ня будзе праведзена тое, што зрабілі ўжо ў сябе ўсе культурныя народы: *пакуль касьцёл (царква) ня будзе аддзелены ад дзяржавы, пакуль „слугі божыя“ ня будуць пазбаўлены прывілеяў і ўлады высокіх дзяржаўных урадоўцаў, аплачываных дзяржавай — з народнага мазаля*!

Радавая нота Польшчы.

Радавы пасол у Варшаве Войков аддаў міністру Залескаму новую ноту—ў адказ на пратэст польскага ўраду проці ўзнаўленьня ўмовы ССРР з Літвой—ў справе польска-літоўскага спору аб Віленшчыну.

Радавы ўрад ізноў ясна высказаў свой пункт гледжаньня на справу гэтага спору,—зусім ня спрэчны з Рыжскім Трактатам. Радавы ўрад—ў Рыжскім Трактаце—зрокся правоў і прэтэнсіяў да зямель, наложаных на захад ад граніцы, праведзеной Рыжскім Трактатам, ды абязаўся прызнаць кожнае паразуменьне, якое-б адбылося між Літвой і Польшчай у справе гэтых спорных земляў. Але дагэтуль радавы ўрад не атрымаў яшчэ ніякага паведамленьня аб такім паразуменьні—ні ад польскага ні ад літоўскага ўрадаў. Што-ж датычыць „пастановы“ Рады Паслоў (Антанты), на якую пазываецца польскі ўрад, дык радавы ўрад ня мае ніякіх абавязкаў ані падставаў прызнаваць у спорцы выключна між Польшчай і Літвой „пастанову“ нейкай „трэцяй стараны“ — ў асобе тых ці іншых дзяржаваў, якія ня маюць ані гістарычных, ані маральных, ані юрыдычных правоў распараджацца гэтымі спорнымі тэрыторыямі. Як ведама, і Літоўскі ўрад так сама ня прызнаў „пастановы“ Рады Паслоў. З усяго гэтага ясна, што ўзнаўленьне Трактату з Літвой зусім не паддае сумліву польска-радавае граніцы, праведзенае Рыжскім Трактатам.

У канцы нота сцьвярджае з боку ССРР жаданьне міру і прыязьні з усімі народамі ды шчырае імкненьне народаў ССРР да прыязьні з народам польскім.

Вельмі цікаўнае тлумачэньне дае гэтай ноце радавая прэса.—Маскоўскія „Известия“ пішуць (гл. „Варшавянка“, № 317):

„Радава-Літоўскі Трактат імкнецца выключна да ўсталеньня міру, не скіраваны ён ні проці якой трэцяй дзяржавы, дык і не павінен быў выклікаць трывогі з ніякага боку. Але вось аднак-жа выклікаў ён алярм (трывогу) сярод уплывовых ваенных колаў Польшчы, на зачэпныя пляны якіх радавая прэса ня раз ужо зварачала ўвагу. Да гэтага трэба дадаць узмацаваньне ўплываў на дзяржаўныя справы Польшчы абшарнікаў, якія лятуцяць аб звароце сваіх былых маёнткаў па-за межамі Польшчы. Усім гэтым чыньнікам не магло спадабацца цясьнейшае зьбліжэньне ССРР з Літвой, якое робіць значна цяжэйшымі ўсялякія (ваенныя) авантуры ў усходняй часткі Эўропы“.

Далей газэта зьбівае падсунутыя польскай прэсе францускай дыпляматыяй закіды, быццам Літоўска-Радавы Трактат пярэчыць абязацельствам Літвы перад Лігай Народаў. Але правы і абавязкі Літвы перад Лігай ня могуць быць ані меншыя ані большыя, як правы і абавязкі такога-ж сябры Лігі — Нямеччыны, якая мае з Радамі акурат такі-ж самы Трактат, ды з якім „саюзьнікі“ ўжо неяк пагадзіліся... Польшча з Францыяй дамагаліся, каб Рада Паслоў — „пакарала“ непакорную іх пастанове Літву... Але рашучы пратэст Англіі і тут выклікаў іх паражэньне... Тады польская прэса абвясьціла, што радава-літоўскі Трактат наагул—ня мае значэньня...

У канцы артыкул выражае здаваленьне, што абмен нотамі да канца выясьніў палажэньне, дык, можа, пры такім-ж шчырым жаданьні з боку Польшчы, якое выявіў ССРР, зьбліжэньне ССРР з Польшчай апыніцца на адпаведным шляху...

Ну, апошняе дык даволі сумліўна!

У Польшчы.

„Чорныя кашулі“ ў Варшаве.

У Варшаву, як пішуць газэты, прыехала цэлая „дэлегацыя“ італьянскіх фашыстаў —з „асабістым прыяцелем Мусоліні“, адным з найвыдатнейшых павадыроў фашызму. Гэтая дэлегацыя, відаць, запраўды-ж мае нейкую „місію“ ў Польшчы, бо яе павадыр, гэны самы „асабісты прыяцель Мусоліні“, зрабіў візыту самаму марш. Пілсудскаму, з якім меў даўжэйшую гутарку... Ходзяць па Варшаве гэтыя фашысты ў слаўных „чорных кашулях“ (можа азнака — чорнага тэрору?!), дый у тых-жа фашыстаўскіх „мундзірах“ былі і ў прэм‘ера. Як піша „Роботнік“, гэтыя фашысты, прыехаўшы ў Польшчу з пашпартамі „дыпляматаў“, адбываюць нарады з — „радзімымі польскімі фашыстамі, ды ўвайшлі ў сувязь з рознымі афіцыяльнымі асобамі“... Усё гэта вельмі не падабаецца пэпээсам, на мейсца якіх іх былы павадыр узяў — пад сваю высокую руку—фашыстаў...

На паседжаньні бюджэтнай камісіі, у часе разгляду сьметы міністэрства замежных спраў, пэпээсаўскі пасол Прагер заявіў пратэст проці гэтага адкрытага флірту найвышэйшых дзяржаўных урадоўцаў з „чорнымі кашулямі“ з Рыму, лічучы гэта — „правакаваньнем работніцкай клясы на такія паступкі, якія могуць мець непажаданыя агульныя пасьледзтвы для Польшчы“...

Прысутны прадстаўнік міністэрства заявіў, што міністэрства замежных спраў не можа ўзяць на сябе адказнасьць за візыту італьянскіх фашыстаў у Польшчу...

Безрабоцьце ў Польшчы пачало расьці.

За час ад 6 да 13 лістапада лічба беззработных павялічылася ў Польшчы на 1.646 асоб.

Трэбуюць прыбаўкі.

Прадстаўнікі так-зван. „камунікацыйнага блёку“ (чыгуншчыкаў, машыністаў і паштавікоў) зьвярнуліся да міністра скарбу — у справе паданых ураду мэмарыялаў аб паляпшэньні быту і павялічэньні пэнсіяў.

Ці ўрад забароніць вываз з краю збожжа?

„Роботнік“ паведамляе, што вестка, паданая „Усходнім Агенцтвам“ аб тым, быццам урад мае забараніць вываз збожжа з Польшчы, аказалася—няпраўдзівай. Праўда, Эканамічны Камітэт Рады Міністраў разглядаў гэтую прапазіцыю, але большасьці ў габінэце марш. Пілсудскага, Мэйштовіча і Незабытоўскага яна не знайшла... Пастаноўлена затое купіць на вялікую суму хлеба... заграніцай (—мо‘ таго самага, які вывезены абшарнікамі?) „Роботнік“ слушна кажа, што гэтая „вольная рука“, якую ўрад пакінуў у

У Сойме.

У бюджэтнай камісіі Сойму.

У бюджэтнай камісіі Сойму далей ішла праца над сьметамі паасобных міністэрстваў. Цікаўна, што пэпээсаўскія дакладчыкі адмовіліся ад дакладаў па міністэрствам справядлівасьці і публічных работ. Як ведама, міністрам апошняга зьяўляецца іх-жа былы сябра Морачэвскі, які выразна сцьвярдзіў, што ён — больш пілсудчык, як сацыяліст, больш абаронца абшарнікаў, як работнікаў...

Пры разглядзе сьметы „Вярхоўнага Адміністрацыйнага Трыбуналу“ (суда) дакладчык востра крытыкаваў гэтую ўстанову—за тое, што яна неяк „не сьпяшаецца з разглядам спраў, якія чакаюць сваей чаргі па паўтара года“...

Камісія разглядзела ды прыняла бяз зьменаў бюджэты: Рады Міністраў, Дзяржаўнага кантролю, мін. замежных спраў (з дробненькімі зьменамі; прапазіцыя п. Васынчука аб зьмяншэньні дыспазыцыйнага фонду міністра з 6 мільён. на 3 была—дзякуючы пэпээсам—адкінена). Вельмі цікаўна, што на заяўленае нядаўна—з ініцыятывы ППС—дамаганьне, каб міністар Залескі зрабіў у камісіі экспозэ аб міжнародавай палітыцы, урад папросту навет не зьвярнуў увагі. Аб „праграмнай прамове“ мін. земляробства мы ўжо пісалі.

Найбольш цікаўная была дыскусія ў камісіі ў справе бюджэту „зьмілітарызаванага“ мін. унутраных спраў. У камісію ўрад зьявіўся ў асобе—аж 20 асоб розных генералаў ды палкоўнікаў—з іх ад‘ютантамі... Дык, відаць, крытыкаваць урад трэба было вельмі асьцярожна... Пасьля дакладчыка, які трэбаваў значнай ашчаднасьці ў бюджэце, крытыкуючы розныя непатрэбныя выдаткі, слова ўзяў міністар генерал Складкоўскі. Міністар вельмі хваліў свой „новы курс“, ці „новую эру“—у адносінах адміністрацыйнай улады да насяленьня, пазываючыся на ведамы свой „рэвалюцыйны“ цыркуляр—аб тым, каб старосты асабіста прымалі кожнага прасіцеля...

У распачаўшайся дыскусіі паслы з розных клюбаў востра крытыкавалі бюджэт ды палітыку ўраду, закідаючы міністру — выкіданьне добрых фахоўцаў і назначэньне „сваіх людзей“, хаця й зусім незнаёмых з справамі. Закідалі нарушэньне законаў і г. д...

З другога боку, паслы-пілсудчыкі з Вызваленьня ды Хлопскага Зьвязку дамагаліся далейшай чысткі адміністрацыі, а перадусім... выкіданьня юрыстаў, якія заўсёды „гнуць управа“...

Украінскі пасол Васынчук востра крытыкаваў дзеяльнасьць новага — „маёвага“— валынскага ваяводы Мэха, за якім на Валыні ўкраінцам жывецца яшчэ горш, чым за папярэднім Дэмбскім.

Рад паслоў падчырківаў усю бязмэтнасьць палітычнай дыскусіі над бюджэтам міністэрства, на чале якога стаіць ваенны генерал, каторы падлягае загадам свайго вышэйшага ваеннага начальства...

Не абыйшлося, ведама-ж, і без страшэнных закідаў міністру — за „толераваньне антыпаньствовай акцыі Грамады“; паслы з правіцы заклікалі яго да яўнага нарушэньня Канстытуцыі — у адносінах да арганізацыі беларускіх сялян і работнікаў.

З „польскага парлямантарызму“.

Газэты пішуць, што ўрад пастанавіў — у працягу ўсей бюджэтнай сэсіі — ня прымаць учасьця у працах соймавых камісіяў— апрача бюджэтнай, лічучы, што звычайная бюджэтная сэсія павінна быць выключна ўжыта на разгляд бюджэту... Хіба пасьля, калі там у канцы астанецца крыху часу, тады, можа, варта будзе заняцца і чым іншым... Дзеля таго ўрад мае не пасылаць сваіх прадстаўнікоў у камісіі, апрача бюджэтнай. Хай сабе паны паслы „дыскутуюць“ адзін з адным, гатуючыся ў уласным соку...

Рада Міністраў, як пішуць газэты, пастанавіла яшчэ „лічыць памершымі ўсе тыя пасольскія інтэрпэляцыі, якія былі пададзены ў папярэднюю сэсію Сойму“, і не даваць на іх адказу... Калі хто з паслоў хоча, каб яго інтэрпэляцыя „паўстала з мёртвых“, хай падае яе нанова ў Сойм...

Абедзьве весткі добра вяжуцца адна з аднэй, малюючы тую „адмену“ (запраўды-ж —адмену!) парлямантарызму, якая запанавала ў Польшчы, ня гледзячы на ўсе тыя падставы, якія мае парлямантарны лад у Польскай Канстытуцыі... Усё-ж трэба думаць, што Сойм знойдзе ў сабе сілу змусіць урад спаўняць абавязкі яго, загадавыя Канстытуцыяй.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той не спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

справе вывазу заінтэрэсаваным абшарнікам,—пагражае далейшым страшэнным узростам дарагоўлі...

Чаму няма вугальля на ўнутраным рынку?

„Кур. Поран." аблічыў, сколькі зарабляюць уласьнікі капальняў вугальля ў Польшчы (сярод якіх фігуруе шмат капальняў, уласьнікам якіх зьяўляецца... польскі скарб!). Пры таннасьці працы работніка, тонна вугальля (62 пуды) каштуе прамыслоўцу, разам з акцызам. 15 злотых. Урад за свае пастаўкі ўмовіўся плаціць прамыслоўцам 19 злотых. Гуртаўнікі-гандляры плацяць прамыслоўцам 24 злоты, а на рынку ў краі цана вугальля—60 злотых!—Дык больш, як 30 — 35 злотых маюць пасрэднікі-гандляры, і прамыслоўцам значна выгадней вывазіць вугальле за граніцу, бо там яны атрымліваюць самі — каля 90 злотых за тонну...

А ўрад яшчэ рабіў розныя палёгкі вывазу... Нічога сабе—гаспадарачка!

Прысуд над безработнымі.

У выніку разрухаў безработных, якія былі ўзьняліся ў чэрвені с. г. у Гостыніне,—акруговы суд у Плоцку засудзіў 4 безработных на 3 гады вастрогу кожнага, 13—на паўтара, 12—на год і 3—на 6 месяцаў. 13 падсудных апраўданы. Апрача таго з засуджаных суд спаганяе 973 зл. 60 гр., як адшкадаваньне за зьнішчэньне ў памяшчэньні павятовае каманды паліцыі.

Кангрэс украінскай нацыянал-дэмакратыі.

У Львове адбыўся кангрэс „Украінскага Нацыянал - Дэмакратычнага Аб'яднаньня" („ундо"). Гэтае аб'яднаньне абыймае амаль ня ўсе ўкраінскія буржуазныя партыі і групы. Кангрэс прыняў рад рэзалюцыяў у справах палітычных, гаспадарчых і культурных. Кангрэс рэзка адмежаваўся ад лявіцы і ад правіцы. У адносінах да Радавай украіны Кангрэс заняў пазыцыю „чаканьня", „асудзіўшы" толькі рашуча камуністычны лад і пераваг; там расейскіх уплываў. У галіне ўнутрана-палітычнай тактыкі Кангрэс даручыў выбранаму цэнтральнаму органу—цеснае супрацоўніцтва з іншымі—ведама-ж буржуазнымі - групамі нацыянальных меншасьцяў Польшчы.

Заграніцай.

Проціпольскія дэманстрацыі ў Літве.

„Słowo" дае падробнае апісаньне антыпольскіх дэманстрацыяў, якія адбыліся ў Коўні ў апошнюю нядзелю. Дэманстрацыі наладзілі літоўскія хадэкі-нацыяналісты, якія закідаюць сучаснаму літоўскаму ўраду — залішне лагоднае адношаньне да палякоў, пагражаючае апалячаньнем краю. У часе вельмі гарачага мітынгу разьвешаны былі сьцягі ды плякаты з надпісамі: „Вон польскія рукі ад школаў у Літве!", „Шляхам еднасьці — да адабраньня Вільні" і г. д. Аратары даводзілі, што палякі — найвялікшы вораг літоўскага народу і г. д. Аратарам, бараніўшым свабоду польскай школы, не давалі гаварыць. Пасьля мітынгу вялізарная таўпа доўга хадзіла па месьце, пакуль ня была дэлікатна рассеяна паліцыяй.

Агульны Збор III Інтэрнацыяналу.

23-га лістапада ў Маскве пачаліся пасэджаньні Агульнага Збору III Інтэрнацыяналу. Прымаюць учасьце ў Кангрэсе дэлегаты 52 краёў.

Адчыніўшы зьезд, Бухарын растлумачыў вялікае значэньне апошніх падзей у Кітаі, а таксама—важнасьць забастоўкі англійскіх вуглякопаў для справы вызваленьня міжнародавага пралетарыяту. Кангрэс пастанавіў звольніць Зіноўева—згодна з яго просьбай—з становішча старшыні і сябры Камінтэрну.

Сьмерць Красіна.

У Лёндане памёр пасол СССР Красін, выдатны камуністычны дзеяч і дыплямат.

Новы канфлікт між Нямеччынай і „саюзьнікамі".

На набліжаючайся ў сьнежні сэсіі Рады Лігі трэба спадзявацца вострага канфлікту між нямецкай дэлегацыяй і саюзьнікамі. Нямецкі ўрад стаіць моцна на тым становішчы, што ад мамэнту ўваходу Нямеччыны ў склад Лігі Народаў дый яшчэ і ў склад яе найвышэйшага выканаўчага органу—на сталае мейсца павінна спыніцца ваенная акупацыя нямецкай зямлі гэтымі роўнымі з ёй у Лізе дзяржавамі. Таксама мусіць быць спынены і ўсялякі ваенны кантроль былых саюзьнікаў над Нямеччынай, што прадбачыць і § 213 Вэрсальскага Трактату. Ня можа быць ужо мовы аб гэтым кантролю, дый яшчэ ў нейкай камісіі, дзе побач з англійскімі і францускімі дэлегатамі маюць кантраляваць нямецкія аружныя сілы чэхаславацкія і польскія штабавікі,—знача штабавікі дзяржаваў, з якімі Нямеччына зусім яшчэ ня лічыць закончанымі свае пасьляваенныя разрахункі, ды з якімі граніцы яна зусім яшчэ ня прызнала аканчальнымі. Дык гэткага „стану прымусова залегалізаванага шпіёнства" з боку сваіх суседзяў у сябе ў краі, як выражаецца нямецкая прэса, нямецкі ўрад дапусьціць ня можа. Нямеччына мае яшчэ і саюзьнікаў, якія не ўваходзяць у склад Лігі ды маюць розныя разрахункі з дзяржавамі—сябрамі Лігі. І гэта ўсё робіць немагчымым для Нямеччыны згадзіцца на гэткае „залегалізаванае шпіёнства" заграNічных штабавікоў, для якіх маюць быць адчынены ўсе замкі ды дзьверы нямецкіх штабаў і арсэналаў. Нямецкі ўрад рашуча адкінуў запрапанаваны Францыяй праект гэткай новай кантрольнай камісіі, якая-б мела сваю сядзібу ў Бэрліне, ды ў склад якое ўваходзілі-бы прадстаўнікі Польшчы і Чэхаславакіі, а старшынёй быў-бы францускі штабавік.

Францускі ўрад заявіў, што гэтая адмова робіць немагчымым паразуменьне з Нямеччынай.

Нямецкая прэса—урадавая і нацыяналістычная—заявіла, што Нямеччыне няма што рабіць у Лізе Народаў, калі Ліга ня толькі не дае ёй раўнапраўнасьці з „вялікімі", але яшчэ аддае яе сувэрэннасьць пад „кантроль такіх другарадных дзяржаў, як Польшча". Нямецкая прэса глуха піша, што пункт гледжаньня Нямеччыны падтрымлівае „адна з вялікіх дзяржаваў". Ясна-ж, што гэта—Англія.

Дык відаць, горача будзе на гэтай сэсіі Рады,—дарма, што будзе ў сьнежні!

Скасаваньне пашпартных візаў між Англіяй і Нямеччынай.

Вельмі павольна Эўропа варочаецца да прадваеннага нармальнага стану-зносінаў ды камунікацыі між дзяржавамі. Пачын гэтага павароту ідзе заўсёды з боку Нямеччыны. Толькі-што адбылося паразуменьне ў справе скасаваньня візаў (каждаразовага дазволу на ўезд у іншую дзяржаву чужаземцаў) між Нямеччынай і радам скандынаўскіх дзяржаваў, у тым ліку—і Фінляндыяй. А цяпер Нямеччына-ж запрапанавала скасаваньне ўзаемна візаў і англійскаму ўраду.

Тлумачэньні фашыстаўскага дыктатара.

Пасьля таго, як агідная, шырока задуманая фашыстамі правакацыя дзеля выкліканьня аружнага канфлікту паміж Італіяй і Францыяй сарвалася, выкрытая да канца францускай паліцыяй,—Мусоліні пачаў „тлумачыцца". У гутарцы з прадстаўніком вялікай францускай газэты „Le Matin" Мусоліні сцьвярджае, што „агульнае парушэньне ў Італіі пачало заціхаць". Францускаму ўраду ён кажа шмат камплімэнтаў (прыемнасьцяў), выступленьні фашыстаў проці Францыі лічыць—„скандальнымі і недапусьцімымі". Больш ён ужо гэтага не дазволіць. Газэты таксама — „закелзаны". Крыху вінавата і сама Францыя, якая—„цярпела ў сябе ворагаў фашызму" (чытай: пасланых Мусоліні правакатараў!). „Дамаганьні Італіі — вельмі скромныя і ў замежнай палітыцы" і г. д.

Вестка аб новым замаху на Мусоліні.

Француская паліцыя, якая спрытна выкрыла правакацыйную работу фашыстаўскіх агентаў у Францыі, толькі-што высачыла новы замах (можа таксама — правакатараў?) — на Мусоліні. Гэтым разам замахоўцы быццам італьянскія анархісты, якія мелі прыехаць з Амэрыкі.

Як ведама, ўсялякая правакацыя „мае два канцы",—дык ніколі няведама, якім канцом дый каго яна ўдэрыць. Так было і з Сталыпіным у царскай Расеі.

Разгром фашыстамі каапэрацыі.

Апошні выпуск Міжнародавага Каапэратыўнага Бюлетэня апісвае разгром каапэрацыі ў фашыстаўскай Італіі.

Перадусім фашысты пачалі рабіць націск на агульныя сходы, гвалтам накідаючы ім сваю волю. Паасобныя каапэратывы прымушаліся далучацца да фашыстаўскае цэнтралі (акурат так сама, як у нас беларускія каапэратывы былі прымушаны далучыцца да польскае цэнтралі—нам гэта знаёма!). Фашысты гвалтам накідалі каапэратывам фашыстаўскіх дырэктароў, руйнаваўшых усю працу, абы толькі падчыніць каапэратараў партыйнай дысцыпліне фашыстаў. Урэшце, у розных ваколіцах, у залежнасьці ад ступені „непакорнасьці" каапэратараў фашыстам, на каапэратывы накладаліся непамерныя падаткі, зусім забіваўшыя іх.

У выніку гэтага з агульнае лічбы **20,000 каапэратываў** Італіі ў 1921 годзе (да фашыстаўскага перавароту) цяпер істнуе на ўвесь край усяго толькі... **2,000 каапэратываў**, або **дзясятая частка!** Гэтак фашызм, які знаходзіцца цалком на ўслугах капіталістаў і буйных гандляроў,—у імя „сацыяльнае раўнавагі" — забівае каапэрацыю, як вельмі няпрыемную для капіталістаў спробу спажыўцоў бараніцца ад дыктатуры капіталу.

Аб чым пішуць.

Культура і палітыка.

Рэдакцыя „Kur, Wil." вельмі засаромілася за... польскую ўладу, якая ня пусьціла ў Менск на навуковую канфэрэнцыю беларускіх культурных дзеячоў з Заходняе Беларусі. У перадавіцы з серады газэта з гэтае прычыны піша:

> „Чаму гэтак сталася?
>
> Вось-жа польскія ўлады выходзілі з таго пункту гледжаньня, што ехаць на зьезд у Менск ня можа быць дазволена прадстаўнікам і прыхільнікам тых палітычных арганізацыяў, якія вядуць варожую да польскае дзяржаўнасьці работу, выяўляючы яўную прыхільнасьць да Радавае Беларусі.
>
> Да гэткіх арганізацыяў залічана Грамада і яе прыхільнікі. Згэтуль — забарона ехаць у Менск тым, хто хоць крыху зьвязаны з Грамадой ці з яе ідэалёгіяй.
>
> Думаем, што тут ёсьць некаторае перамяшаньне паняцьцяў і прынцыпаў.
>
> Дазвол на культурную ці навуковую працу ня можа быць наградай ці-то карай за палітычныя перакананьні і так-званую „благанадзёжнасьць".

Так думаюць паны польскія „дэмакраты". А вось ёсьць такія беларускія „дэмакраты", якія думаюць інакш і зусім згодна з становішчам польскае ўлады ў справах адносінаў між культурай і палітыкай! Іменна: кс. Адам Станкевіч, Фабіян Ярэміч і А. Більдзюкевіч, захапіўшыя ў хадэцка-сельсаюзьніцкія рукі кіраўніцтва культурнай установай пад назовам „Інстытут Беларускае Культуры і Гаспадаркі", выдалі надрукаваны ў № 37 „Сялнскае Нівы" „Маніфэст" такога зьместу:

> Сябрамі Інстытуту **могуць быць асобы бяз розьніцы палітычных перакананьняў,** бо Інстытут зьяўляецца культурнай установай, аднак кожны сябра павінен прычыняцца да развою Т-ва (§ 13 Статуту). Дзеля таго, што палітычная партыя „Работніцка Сялянская Грамада" пачала агітацыю проці Т-ва Бел. Інст. Гаспад. і культуры, **сябры гэтае партыі ня могуць быць сябрамі Інстытуту.** Урады Гурткоў і Аддзелаў Інстытуту не павінны болей прыймаць у Інстытут сяброў „Грамады". З сябрамі „Грамады", якія ўжо запісаліся ў Інстытут, трэба паступіць згодна з § 12 Статуту — запрапанаваць Аддзелу вылучыць іх, калі яны самі ня згодзяцца выступіць, падаючы пісьменную заяву (§ 11). Калі-б сябры Ураду Гуртка Інстытуту належылі да „Грамады", павінны яны наказаць аб гэтым у свой Аддзел або ў Цэнтралю. Аддзел або Цэнтраля пастанове аб далейшай долі такога гуртка і напіша каму перадаць усе справы й маемасьць Гуртка.
>
> УВАГА: сябром, што вылучаны або выступілі—складкі не зварачаюцца.
>
> **Цэнтральны Урад**

Вось табе і „культурнасьць" і „непалітычнасьць" паноў павадыроў „Інстытуту". **А ўсё — за тое, што наша газэта прызнала гэтую тройку — неадпаведнай да кіраваньня культурнай установай!**

„Маніфэст" толькі пацьвярдзіў наш пагляд на гэных паноў...

Дзень у адзіночцы.

(на Лукішках).

У магілі, як быццам, і ціха і цёмна,
Час, што чарвяк той намоклы, паўзе —
Думкі ўсю ночку хадзілі ля дому,
Капала сонна сьляза па сьлязе...
Хрыпла раздаўся сьвісток за дзьвярамі.
Хто-та пад цэлю маю падыйшоў,
Глянуў у вочка і зьвякнуў ключамі...
Моўчкі ён далей куды-та пайшоў.
Чуецца: Кашляюць, стогнуць, уздыхаюць...
Недзе другі сьвіст пранёсься ўдалі.
Дзьверы браждажаць; іх, здаецца, ламаюць...
Глуха „Адзін, два" чуваць за дзьвярамі.
Ляскае ключ, расчыніліся дзьверы.
Сонны дазорац „Вядро" мармытнуў,
Бразнуў дзьвярамі, як злосны бяз меры...
Зьвяк ад залеза і звон пацягнуў...
Скончана. З міскі бяз мыла памыцца
У дзірку праз дзьверы вады падалі,
Хлеба паўхунцік і кавы напіцца...
Дзень так пачнецца бяз меры даўгі.
Гоман-стаіць глухі, бесканэчны
Ўзрушыцца часам хадою, званком,
Вырвецца кашаль і стон чалавечы,
Стукне дзесь нехта і зьвякне ключом.
Рэзка скрыпяць, адчыняюцца дзьверы:
„Спацар". Дазорац далей пайшоў.
Бразнула, стукнула моцна бяз меры...
Люлька ня стлела і спацар прайшоў.
Зноў ты ў цэлі, па цэманту ходзіш.
Думкі адна за адною бягуць,
Сумна вачамі па небу ты водзіш.
Краты на неба глядзець не даюць.
У кнігу заглянеш — словы мігцяцца
Строчкі з туману, усё роўна, устаюць...
Думкі аб дому бягуць, грамадзяцца:
„Дзеткі бяз хлеба"! — і сьлёзы цякуць.
Дзірка адкрылась. „Абед" кажуць, здаецца,
Рэдкае зупы праз дзірку нальюць,
Хлебчаш, сьпяшаешся мо давядзецца
Міску хоць трохі вадой спаласнуць.
Сумныя думкі ізноў апануюць
Ходзіш шалёны, на краты глядзіш.
„Бог і сьвятыя"?!... Чаму не ратуюць?
Маці!... што ты глухая? Маўчыш?
Ляжаж на ложка скраёчку — баішся;
У чорнае вочка на дзьверы глядзіш.
„Карцар за гэта, не пападзіся"!
Шорах нікчэмны... і з ложка ляціш.
Пульварам люльку прагорклу запаліш,
Цэмант шчарнелы анучай пагрэш...
Слаба. Ня роўна ў рабоце, прыстанеш...
Цягнецца дзень, канца не дачакаеш.
Чуеш... Бражджыць і скрыпіць. Пачалося.
Вёдры выносяць і хлеб падаюць
Ціха, „Каляц'я" праз дзьверы хтось просе,
Хутка за ёю і воду нясуць.
Узьняўся сьвіст хрыплы і замірае...
Бразгаюць дзьверы, пасьпешна ідуць,
Лічаць „Адзін два", залпам замыкаюць
Цэлю... і самі куды-та бягуць.
Скончыўся дзень такі доўгі і сумны.
Коцам накрыўшысь, на ложку ляжу.
Думкі аб волі нахлынулі шумна,
„Дзеткі бяз хлеба", заснуць не магу.
Ціха і лёгка праз краты крадзецца
Доўгая ночка ў цэлю маю.
Сэрца трэпечацца ў страху і б'ецца,
Злосна сьляза пабівае сьлязу.

Улад-Ініцкі.

Куток фантазіі.

„Як мы тварылі гурткі".

Не падумайце, што слова „мы" ў гэтым загалоўку абазначае нас—беларусаў! Не: абшарніцкае „Słowo" ў стацьці нейкага наваградзкага „зубра" разумее пад гэтым словам „мы" — палякоў, ці навет—польскую ўладу....

Стацьця абшарніцкае газэты, аб якой мы кажам, заслугуе, запраўды-ж, на тое, каб яе зьмясьціць у аддзеле „Куток фантазіі": аўтар яе навет ня ведае, што істнуе на сьвеце Беларусь, што яна істнавала і—будзе істнаваць вечна, ня гледзячы на ўсю панскую зьвягу і гістэрычныя выкрыкі! Ня ведае і таго, што беларускі адраджэнскі рух—шмат старэйшы, чым — бальшавізм!

Але спрачацца з „зубрамі" немагчыма: яны-ж думаюць неяк інакш, чым мы: ведама, па-зуброўскаму! Дык толькі падаем дaслоўна пераклад стацьці „Słowa".

. . . .

.... Мушу падаць адзін абразок з мінуўшчыны,—абразок „бэстыяльскага" выступленьня п. п. Рагулі, Кахановіча і кс. Станкевіча і бяссільля нашых уладаў.

Было гэта ў маі 1924 году ў часе аб'езду Прэзыдэнтам Рэспублікі панам Войцеховскім Наваградзкага ваяводзтва. Вось-жа гэная ўспомненая тройка за колькі дзён да прыезду п. Прызыдэнта ўладзіла веча, на якім п. Рагуля—перад тысячнай таўпой—сказаў парасейску прамову гэткага зьместу:

„Товарищи, не у одного из вас спина исполосована ненавистными белыми польскими нагайками, не у одного из вас под ногтями занозы, загнанныя ненавистными белыми польскими палачами. Какая ирония судьбы: здесь по вашим спинам безнаказанно гуляют белыя польския нагайки, а там—за несколько вёрст—на востоке гордо развевается флаг свободной Белоруссии!... Паны тут назначают вам платить страховки, так покажите-же вы панам страховку"!

А пасол Кахановіч зьвярнуўся да польскіх паліцыянтаў, прысутных на вечы і стаяўшых побач з прамоўцамі, і—паказуючы ня іх пальцам — з пенай на вуснах пяяў: „Ах вы, польскія сабакі! Кусі, кусі, кусі, — ня ўкусіць!"

Хіба няма патрэбы гаварыць, якія вынікі далі гэткія выступленьні. Памыляюцца многія, думаючы, быццам тутэйшае насяленьне ненавідзіць польскі ўрад. Не, паночкі, яно толькі пачула да яго глыбокую абразу і пагарду, як кожны з нас тое-ж самае пачуе ў адносінах да чалавека, які пазволіць, каб яму бяскарна плявалі ў вочы...

Есьць, на-жаль, у нашым грамадзянстве такія наіўныя людзі, якія вераць у ідэйнасьць „беларускіх" дзеячоў. Не, панове, пакіньце гэтую памылку. Усе гэныя дзеячы зьяўляюцца платнымі бальшавікамі, агентамі, якія працуюць за грошы і на карысьць бальшавікоў.

У Менску ў 1917 годзе, за часоў Керанскага, неяк з пачыну, калі не памылюся, пана Рамана Міркухі (?!), было склікана беларускае веча, якое адчыніў пан Петрусэвіч і пачаў прамаўляць па-беларуску. Раптам пан Рагуля, якога я меў прыемнасьць ці мо' няпрыемнасьць знаць, расейскі салдат і выразны бальшавік, гаркнуў на ўсю салю: „Долой провокатора, прочь с белорусским языком, здесь нет никакой Белоруссии, мы все стоим под единым флагом российской социальной революции!" Вось у гэтым сваім выступленьні пан Рагуля паказаў усю сваю беларускую ідэалёгію, і прашу мне верыць, што і рэшта беларускіх дзеячоў паходзіць з тых самых грошы (!).

Не, паны Рагулі і яму падобныя, ня думайце, што ўсе такія наіўныя і паверацць, што вам ідзе аб нейкую там Беларусь, — як вы, так і мы добра ўсе ведаем, што ніякае Беларусі ніколі ня было, няма і ня будзе, можа тут быць або Польшча, або — як вам марыцца—Расея!

Не пярэчу, што ў гэты мамэнт вашы шансы—лепшыя, бо на вашым баку і бальшавіцкія грошы, і няздарнасьць нашых уладаў бясьпечнасьці, якая цяпер дайшла да найвышэйшае ступені з мамэнтам залегалізаваньня гурткоў. Раней бяскарнае і яўнае разваліваньне дзяржавы было толькі вашым прывілеем, бо вы ўкрываліся пад прыкрыцьцем блага панятае пасольскае недатыкальнасьці, а вашыя агенты (без мандатаў) мусілі патайна насаджаць камуністычныя ячэйкі і часта-густа, пры няўдачы, сядзець за кратай,—а цяпер усё гэтае „плюгавства", дзякуючы наіўнасьці нашых уладаў, якія далі сябе ашукаць, вылезла наверх—пад імем гурткоў—замест даўнейшых камуністычных ячэек. Сяньня паны гурткоўцы, ідучы за прыкладам сваіх павадыроў—недатыкальных паслоў, з усей бясчэльнасьцяй трубяць направа і налева, што Польшча ўжо дажывае свае апошнія дні, што ўжо сьвітаюць для іх досьвіткі „лепшага бальшавіцкага заўтра". Іх кліч—„Далоў Польшчу, няхай жыве непадзельная Радавая Беларусь!" І сяньня ніводзін гуртковец гэтага ня ўкрывае, а кажа гэта галасна кожнаму, хто мае вушы, каб чуць, ды зумысьля іх не затыкае.

Гурткі растуць, як грыбы пасьля дожджу, з гадзіны на гадзіну; паводле слоў самых гурткоўцаў, ня міне і месяца, як не астанецца ніводнае найменшае вёсачкі, дзе-б ня было гуртка. А тады настане дзень расплаты, і польская вага згэтуль жывая ня выйдзе....

Гэтак думаюць паны гуркоўцы. Quousque tandem Catilina abutere patientiam nostram?"

Ці ня час ужо аб гэтым падумаць?

. . . .

Падаўшы цалком стацьцю „Słowa", мусім усё-ж-такі зрабіць адну папраўку: цяпер дык ані пан Рагуля, ані кс. Станкевіч ужо напэўна ня скажуць таго, што гаварылі на апісаным вечы ў Наваградчыне!

З жыцьця „Грамады“.

Для гарнякоў.

Пры дапамозе гуртка Грамады в. Крупіцы, Арлянскае гм. Лідзкага павету, зроблены грашовы збор на карысьць бастуючых англійскіх гарнякоў.

Грошы ў суме 20 зл. перасланы Цэнтр. Сэкрэтарыяту.

У гуртках

✕ Солтыс в. Савалёўкі, Жыдамлянскае гм., Горадзенскага пав. — Сухоцкі, а з ім Піліп Мышка, Пятрук Аутко і Рыгор Казёл, ажно выюць на „Грамаду“, ды нічога не памагае: гурткі растуць!

✕ Ня гледзячы на запужваньні солтыса Сухоцкага і войта Быльчынскага, 17. X. с. г. у в. Савалёўцы, Жыдамлянскай гм., Горадзенскага пав., адбыўся сход гуртка „Грамады“. На сходзе прысутныя 100 сяброў вынясьлі пастанову—1) дабівацца звальненьня палітычных вязьняў, 2) дабівацца дзяржаўнай беларускай школы, 3) скасаваньня асадніцтва і 4) трэбаваць, каб пацягнулі да адказнасьці за надужыцьці войта Быльчынскага і солтыса Сухоцкага.

✕ На 27. IX. г. г. у в. Галынь, Любчанскай гм., Наваградзкага пав., быў назначаны сход гуртка „Грамады“, — і староста быў паведамлены. Але паліцыянт № 418 прыехаў на кані ў вёску, страшыў людзей і дапяў таго, што сход не адбыўся. У адказ на гэты спосаб барацьбы з „Грамадою“ яшчэ 10 асоб запісаліся ў тамашні гурток, каб мацнейшы даць адпор напасьнікам.

✕ На сходах гурткоў „Грамады“ у в.в. Баяры, Мядзьведзева і Перадолы, Плiскай гм., Дзісьненскага пав., грамадзісты вынясьлі рэзалюцыю: 1) ня піць гарэлкі і 2) дабівацца роднай школы і зямелькі. — Хай гэта служыць прыкладам для другіх!

✕ 1. X. г. г. у в. Аброва, Сьвята-Вольскай гм., Косаўскага пав., пэпэзсаўскі інструктар з абшарнікам з двара Аброва хацеў заложыць „Кулко Рольнічэ“; але сяляне адкінулі гэтую прапазыку, зазначыўшы, што яны ідуць толькі з „Грамадою“.

✕ На сходзе гуртка Грамады ў в. Грабёваўшчына, Нова-Сьвержанскай гм., Стаўпецкага пав., камандант Белькаўскага паст. зажадаў сьпіску сяброў гуртка; яму не далі. Дык назаўтра паклікалі на пастарунак старшыню, сэкрэтара і скарбніка гуртка і сьпісалі іх „жыцьцёпісы“, пагражаючы, што „аддадуць іх у войска“.

Ад рэдакцыі. Гэтую справу скіравалі мы ў Сойм. Кл. Б. С. Р. Грам.

✕ Месца ня мог знайсьці камандант Нараўскай пал., даведаўшыся, што ў в. Бялкі, Нараўскай гм., Вельскага пав., заснаваны гурток „Грамады“. Хацеў дастаць сьпісак сяброў, але яму не далі. Стурнёва камандант прыйшоў сам да сябе, а гурток працуе і пашырае свае ўплывы.

✕ Паведаміўшы старосту, гурток „Грамады“ ў в. Літва, Палачанскай гм., Маладэчанскага пав., 3. X. г. г. хацеў зрабіць закрыты сход, але камандант з Дэрэчынскага паст.—ня ведама чаму—не дазволіў. Пасьля камандант выйшаў з вёскі, дык вясковы кулак-шпік, Язэп Лечан, пілнаваў, каб не адбыўся сход.

✕ 13. IX. г. г. на ігрышчы ў в. Таргуны, Докшыцкай гм., Дзісьненскага пав., шпік Янка Варанковіч заклікаў сялян ня пісацца ў „Грамаду“, пагражаючы грамадзістам арыштам. Сяляне на гэтую брахню не зварачваюць увагі і шлюць прывітаньне: „Няхай жыве Грамада“!

Ад Цэнтральнага Сэкрэтарыяту.

Булгацка-Лычыцкаму гуртку, Наваградзкага пав. Ліст атрымалі. Беларускі сьпеўнік друкуецца і ў хуткім часе выйдзе. Розныя кніжкі можаце выпісаць з беларускае кнігарні (Вострабрамская № 1) куды і зьвярнецеся з запытаньнем.

Парэцкаму гуртку, Слонімскага пав. Чытаць з кніжкі прамовы паслоў на сабраньні гурткоў Грамады забараніць ніхто ня можа. Перачытаўшы-ж наперад і пасьля перадаваць зьмест іх сваімі выразамі небясьпечна, бо мы простыя сьмяротныя і нятыкальнасьцю не уладаем.

Згублена пасьведчаньне, выданае, як старшыне Кульгайскага гуртка, Асапончыку Уладзіміру за № 1825 уневажняецца. Новае пасьведчаньне выдана за № 7768.

Рудабішчэнскаму гуртку. Не чакаць ніякага зацьверджаньня, а на места былога сэкрэтара выбраць другога. Да выбараў абавязкі гміннага сэкрэтара выпаўняе яго заступнік. Справу адносна сэрвітута перадалі ў юрыдычны аддзел.

Каралеўскаму гуртку. На сабраньні могуць быць прысутнымі ня толькі сябры Грамады з сваей вёскі, а і з другіх вёсак, гміны і павету, калі яны маюць парт. білеты. На іншыя пытаньні адказываем лістом.

Агародніцкаму гуртку. Паліцыянт мае права быць на сходзе. Калі ад Старасты на пададзенае паведамленьне адказу жаднага няма, то сход рабіць можна.

Алексіцкаму гуртку. Калі будзе паўторна вызначаны павятовы зьезд у Слоніме, то аб ім будзе абвешчана ў газэце за дзьве нядзелі да вызначанага часу зьезда.

Востраўскаму гуртку. Цэнтр. Сэкр. шлець шчырую падзяку за сабраныя грашавыя ахвяры на карысьць пагарэльцаў Дзісеншчыны і Піншчыны.

Партыйны білет № 15985 і пасьведчаньне сэкрэтару Сенькоўшчынскага гуртка Белар. Сял.-Раб. Грамады, Слонімскага пав., за № 3594 на імя Ягаўдзіка Гіляра ўневажняецца.

ХРОНІКА.

Прыезд высокіх гасьцей. У чацьвер, 25 лістапада, у Вільню ў урадавым характары, як старшыня рады міністраў, прыехаў маршалак Пілсудскі.

Яго прыезд папярэдзіў прыезд міністра справядлівасьці пана Мэйштовіча.

Колькі дзён назад прыяжджаў на зьезд абшарнікаў міністар Незабытоўскі.

Як відаць, Вільня пачынае іграць нейкую важную ролю ў жыцьці польскае дзяржавы—асабліва пасьля Нясьвіжа. Цэлы рад віленскіх юрыстаў нядаўна атрымаў назначэньні ў склад Юрыдычнае Рады ў Варшаве, а асобы п. п. Пілсудскага, Мэйштовіча і Незабытоўскага вельмі крэпка зьвязаны з Вільняй.

Ці не адказ гэта на ўзмоцненую літоўскую акцыю ў кірунку прызнаньня правоў Літвы на гэтую адвечную сталіцу Беларуска-Літоўскае дзяржавы?!

Галоўная Управа Таварыства Беларускае Школы пастанавіла: 1. Падаць праз Віленскі Куратарыум Міністру Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы мэмарыял аб тым, каб Школьная Улада прадоўжыла тэрмін здабыцьця ўрадавае кваліфікацыі для вучыцялёў беларускіх пачатковых школ; 2. Пачыніць крокі ў справе арганізацыі Беларускага Вучыцельскага Саюзу; 3. Прызнаць патрэбнасьць арганізацыі і Касы Ашчаднасьці для вучыцялёў і адміністрацыі Віленскае Беларускае Гімназіі; 4. Падтрымліваць самадзейнасьць Гурткоў і Акружных Упраў Таварыства Беларускае Школы; 5. На будову Народнага Дому ў гор. Вялейцы ахвяраваць 150 злотых.

Гадавы агульны сход студэнтаў беларусаў Віленскага унівэрсытэту. 28./XI. г. г. ў нядзелю ў 4 гадз. папаўдні ў сваім памяшчэньні на вул. Сьв. Ганны № 2 адбудзецца агульны гадавы сход студэнтаў беларусаў Віленскага Унівэрсытэту з парадкам дня: 1) Справаздача ўступаючага ўраду; 2) Справаздача рэвізыйнай камісіі; 3) Выбары новага ўраду і рэвізыйнай камісіі; 4) Бягучыя справы.

Прысутнасьць усіх сяброў Белар. Студэнц. Саюзу ў Вільні абавязкава.

Ізноў „авансік“? Ня гледзячы на „новы курс“, Павлюкевічу, відаць, ізноў удалося раздабыць „авансік“ на ягоную „працу“: аб гэтым сьведчыць выхад новага нумару памершага ўжо было ягонага „Беларускага Слова“. У гэтым нумары чуецца нейкі новы тон: відаць, па загаду „хлебадаўцаў“, Павлюкевіч ужо не гавора аб „дабрадзействах“, якія беларусы нібы-та маюць ад Польшчы, а як-быццам сам нечага „трэбуе“. Лінія гэтая—дужа ясная: нельга ж вечна лгаць, што беларусам нехта нешта дасьць самахоць, — дык і Павлюкевіч „трэбуе“, робячы закід грамадзістам, што яны вядуць няўдачую палітыку ды павінны рабіць так, як ён, Павлюкевіч....

Ведама, каб рабілі так, як ён, дык іх кішані мо‘ і таўсьцелі-бы, але-ж беларускі народ у цэлым мадзеў-бы так сама, як мадзеў дагэтуль... Дык і новы тон панскага найміта нікога не перakанае!

Зьезд літоўскіх сялян. 23 лістапада адбыўся у Вільні зьезд літоўскіх сялян, які займаўся чыста гаспадарчымі справамі. Пастаноўлена прыступіць да арганізацыі сялянства на груньце ўтварэньня літоўскага сельска-гаспадарчага т-ва, банку і г. д. Адзначана была нястача ў літвіноў прафэсіянальных школ, на што мусіць быць зьвернена асаблівая ўвага. Урэшце зьезд пастанавіў прывітаць д-ра Басановіча з прычыны яго юбілею, сьвяткаванага ў той-жа дзень.

Абход юбілею д-ра Басановіча. У аўторак, 23-га лістапада, у салі Купецкага Клюбу ў Вільні, перапоўненай народам, адбыўся ўрачысты абход 75 лецьця урадзін і 50-лецьця грамадзкае і навуковае працы выдатнага літоўскага дзеяча д-ра Яна Басановіча. На абхадзе—апрача літвіноў—былі і запрошаныя госьці другіх нацыянальнасьцяў нашага краю — беларусы, жыды і навет некаторыя палякі.

Урачыстасьць распачаў сваей прамовай д-р Альсэйка, старшыня Літоўскага Камітэту ў Вільні, які адзначыў заслугі гэтага тварца першае літоўскае газэты пазамежамі Расеі — у Прускай Літве,—газэты, якая будзіла ў літоўскай масе ў краю адраджэнскі рух, пранікаючы з-за мяжы кантрабандай. Пасьля кс. Заёнчкоўскі прачытаў абшырны рэфэрат аб жыцьці і працы юбіляра.

Распачаліся прамовы гасьцей і дэлегатаў установ. Першы прамовіў рэдактар „Przegl. Wil.“ польскае краёвае часопісі, Людвік Абрамовіч, які пачаў гаварыць крыху дзіўна: тлумачучы, чаму павінен быць і польскі голас на гэтым сьвяце. У такім-жа духу гаварыў і рэдрктар „Kur. Wil.“ п. Сьвеховскі. Ад жыдоўскага грамадзянства выступалі д-р Выгодзкі і рэдактар „Тогу“ Рэйзін; апошні дужа хораша сказаў аб патрэбе яднаньня і салідарнасьці ўсіх народаў. З беларусаў першы гаварыў грам. Луцкевіч, які ад імя Бел. Навук. Т-ва віншаваў юбіляра, як нязвычайна шчасьлівага чалавека, каторы прыждаў зьдзейсьненьня таго ідэалу, за які змагаўся 50 гадоў: незалежнасьці Літвы. Грам. Луцкевіч адзначыў асабліва заслугі юбіляра на груньце літоўскае навукі, ды ўспомніў, як да вайны беларусы спагадна аднасіліся да навуковых прац літвіноў, бо-ж навука — найлепшы саюзьнік адраджаючыхся народаў і найлешп выяўляе праўду аб слаўнай супольнай мінуўшчыне літвіноў і беларусаў. Закончыў прамоўца сваё прывітаньне паведамленьнем, што навуковае супрацоўніцтва абейга народаў і пасьля вайны пачынае ўзнаўляцца, доказам чаго зьяўляецца прыезд рэктара ковенскага ўнівэрсытэту праф. Біржышкі на навуковую канфэрэнцыю ў Менску. Другі беларускі прамоўца, кс. Станкевіч, прамаўляючы ад імя Інстытуту Беларускае Культуры і Гаспадаркі, не абмежаваўся славамі прывітаньня, а зрабіў літвіном у гэты ўрачысты дзень цэнны падарак: папросту **ахвяраваў ім.... Вільню!**

Пасьля чысьленых прамоваў прадстаўнікоў літоўскіх арганізацыяў і перадачы юбіляру, сярод адрасоў, падарку літвіноў-вуглякопаў у Дамброве (пекна шліфаваная табліца з каменнага вугальля знадпісам), была прачытана цэлая куча прывітальных тэлеграмаў з розных мест Эўропы і Амэрыкі. Узварушаны юбіляр горача ўсім дзякаваў.

Вечар закончыўся багатым канцэртным аддзелам.

„Жаноцкая мілітарызацыя“. „Dz. Wil.“, падае цікаўныя веткі аб зьявіўшыхся ў Вільні адозвах, якія заклікаюць польскіх кабет і дзяўчат да тварэньня арганізацыяў, у якіх яны навучаліся-бы службы ў войску. Мае быць створаны „Камітэт мясцовага абучэньня (жанчын) ваеннай абароны краю“. На чале гэтай акцыі, піша газэта, стаіць „Коло Полек“, — „дагэтуль слаўнае ў Вільні толькі living рознымі няўдалымі афэрамі—рэстаранннымі, інтэрнатнымі, трыкатовымі, агароднымі, клюбовымі і г. д. „Кіраваць усей акцыяй мае ваеннае міністэрства — пры бліжэйшай дапамозе „Стралецкага Саюзу“.

Газэта п. Обста кажа, што апошняя вайна паказала, як мала вайсковае жыцьцё кабеты „будуе яе цноту“. Але найбольш баіцца эндэцкі орган таго, што гэта „вайсковая арганізацыя кабет“—у руках стралкоў-пілсудчыкаў — зробіцца арганізацыяй чыста „палітычнай“.

Калі ў 1924 г. закладалася гэная арганізацыя ў паразуменьні з эндэцкім ваенным міністрам Шэптыцкім, дык яна была добрая ды дзявоцкай цноце зусім не пагражала. А вось цяпер—пры Пілсудскім—пагражае страшэнна.

Лекцыя, якая мелася чытацца ў суботу 27 г. м. у Сьніпішскім гуртку, пераносіцца на другі дзень, аб якім будзе абвешчана.

Афіцыяльны курс грошы на 26-га лістапада. Даляр — 8 зл. 95 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

26. XI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,97. Зал. руб. 4,70. Чырвонец 47-25.

СПРАВА АМНІСТЫІ.

Як выглядае „індывідуальная амністыя“?

Урад Пілсудскага пачаў увадзіць у жыцьцё знамянітую „індывідуальную амністыю“. Як гэта робіцца і як выглядае, сьведчаць гэткія прыклады.

10 кастрычніка па загаду міністра справядлівасьці звольнены з Макатоўскай турмы (ў Варшаве) 2 вязьні: работнікі Вагнер і Вайс, з якіх кожны быў засуджаны на 2 гады катаргі (ciężkie więzienie). Першы з іх меў звольніцца па прысуду 2 сьнежня, другі-ж 30 кастрычніка гэтага году. Першаму хацелі даравать 1 месяц і 22 дні, другому—**20 дзён!** Затое 9 месяцаў вастрогу да суда—Вагнэру і 2½ гады—Вайсу не залічаны.

24 кастрычніка прыйшла таксама амністыя для чыгуначніка А. Вашкевіча, кара якому канчалася 4 лістапада гэтага году; гэтак хацелі яму падараваць... 10 дзён!

У Ломжы звольнілі вязьня 21. X., калі прысуд канчаўся 27. X. Гэтак амністыя даравала яму **6 дзён**...

Таксама ў Серадзю амністыравалі дзяўчыну Шапіра за 3 тыдні перад канцом кары (4 гады!)

Ня трэба хіба казаць, што палітычныя вязьні рашуча адмаўляюцца прыняць гэткую „ласку“. Яны праціўяцца гэтаму як найвастрэй—ажно да аказваньня чыннага адпору проці звальненьня—і трэбуюць поўнай амністыі для ўсіх палітычных вязьняў. Ня дзіва, што і па ўсей Польшчы рух за амністыю ня спыняецца, а крапчэе. Вось жменя фактаў з апошняга часу.

Рэзалюцыі з дамаганьнямі амністыі ў працягу апошніх часоў былі прыняты наступнымі ўстановамі і грамадскімі сабраньнямі:

Мястовыя самаўрады.

Мястовая рада ў Замосьці на паседжаньні 11 верасьня г. г. прыняла прапазіцыю Клюбу Радных Клясавых Праф. Саюзаў з дамаганьнем поўнай амністыі для ўсіх палітычных вязьняў у Польшчы. Прапазіцыя была падпісана большасьцяй Клюбу ППС, радным з Поалей Сіон, Бунду і аднаго раднага з жыдоўскага дэмакрат. сьпіску. Пастанова прайшла большасьцю 16 галасоў проціў 5 пры двух устрымаўшыхся.

Мястовая Рада ў Кутне на паседжаньні 21 кастрычніка прыняла прапазіцыю Клясавай Работніцкай Фракцыі і Фракцыі Бунду—усімі галасамі проці трох. Рада дамагаецца поўнай амністыі для ўсіх палітычных вязьняў, спыненьня ўсіх судовых спраў проці работніцка сялянскіх дзеячоў, свабоды сабраньняў і арганізацыі, свабоды слова і друку, скасаваньня кары сьмерці і даразных судоў.

Мітынгі.

12. IX. адбыўся амністыйны мітынг у Дамброве (2000 прысутных); прамаўляў пасол Сахацкі. Такі-ж самы мітынг адбыўся ў Заверці (4000 прысутных), прамаўляў пасол Балін. У абодвых выпадках паліцыя прымусіла ўласьнікаў памешканьняў зачыніць іх, і мітынгі адбыліся пад адкрытым небам. Прадстаўнікі паліцыі абвясьцілі паслом, што нельга гаварыць у справе амністыі. Само сабой, што паслы не паслухалі гэтага прыказу. У Заверці, апрача пасла, прамаўлялі прадстаўнікі ППС—Лявіцы.

Папалудні гэтага-ж дня быў скліканы мітынг у справе амністыі абодвух паслоў у Сасноўцу на Школьным пляцу. Пешая і конная паліцыя шаблямі разагнала некалькітысячную таўпу.

У Лодзі 1. X. адбыліся 4 мітынгі, скліканыя Праф. Саюзамі. На ўсіх мітынгах абгаварывалі справу амністыі.

На мітынгу, скліканым Радай Праф. Саюзаў, сабраныя не згадзіліся на рэзалюцыю ППС, пакуль ня будзе ўключана дамаганьне звальненьня паліт. вязьняў. Пад напорам сабраных ППС павінна была ўступіць.

19.IX. адбыўся ў Дзедзіцах (Цешынская Сілезія) мітынг, скліканы мясцовай Радай Праф. Саюзаў. Прысутных было 1500 асоб. З энтузіязмам была прынята рэзалюцыя аб амністыі.

10. X. ў Быдгошчы адбыўся мітынг на тэму амністыі. Прамаўлялі прадстаўнікі Праф. Саюзу Транспартнікаў, ППС—Лявіцы, НСПП, камуністычны пасол і прадстаўнікі „Stronnictwa Chłopskiego“.

Рэзалюцыі з дамаганьнем амністыі прыняты, апрача таго, на наступных мітынгах: у Быдгошчы 27.VIII — мітынг у лічбе 2000 асоб, скліканы праз NSPP. Згеж 21.VIII—мітынг Таварыства Вольнамысьліцеляў Польшчы. Голешов 19. IX — работніцкі мітынг. Бельск 5.IX—масоўка моладзі. Варшава 4.IX —мітынг з 700 асоб, сазваны Поалей Сіон. Варшава 11.IX—мітынг з 1000 асоб, сазваны Поалей Сіон. Каліш 4.IX—мітынг з 400 асоб. Кракаў—мітынг з 300 асоб, сазваны Поалей Сіон. Львоў 4.IX—мітынг з 300 асоб, сазваны Поалей Сіон. Хэлмовец — мітынг з 300 асоб. Цехановіцэ 2.IX — мітынг з 400 асоб. Холм 24.IX—мітынг, сазваны Праф. Саюзамі. Заверце 12.IX—мітынг з 2500 асоб, сазваны NPCh. Заверце 28.VIII — мітынг мэталёўцаў, прысутных 3000 асоб... Заверце 16.IX—мітынг тэкстыльшчыкаў, 500 асоб. Заверце 19.IX — агульна работніцкі мітынг 5000 асоб. Бельск 11.X — мітынг Сахацкага, 800 прысутных. Берасьце 18.IX—мітынг з 1500 асоб, сазваны Выбарным Кам, Работніцкай Еднасьці. Влоцлавэк 4.IX—мітынг транспартоўцаў. Сэмпольно 11.IX—мітынг Поалей Сіон.

Прафэсіянальныя саюзы.

Рэзалюцыі з дамаганьнем амністыі прыняты на наступных сходах Праф. Саюзаў:

25 верасьня адбывалася канфэрэнцыя Праф. Саюзаў Горадні. Было прысутных 72 прадстаўнікі больш як 10 саюзаў, староньнікаў розных палітычных напрамкаў. Аднагалосна прынята рэзалюцыя з дамаганьнем амністыі для ўсіх паліт. вязьняў.

Радамск: Праф. Саюз дрэўных работнікаў.

Холм: Праф. Саюзы краўцоў, мэталёўцаў, памашнікаў.

Беласток: канфэрэнцыя Праф. Саюзаў Беластоку, Праф. Саюз краўцоў, Праф. Саюз харчавікоў.

Влоцлавэк: агульны сход Праф. Саюзу хімікаў.

Тамашоў: Праф. Саюз тэкстыльшчыкаў.

Сколе: Праф. Саюз работнікаў па дзераву.

Грубешов: Праф. Саюз адзежнікаў, Праф. Саюз работнікаў па дзераву.

Берасьце: Праф. Саюз мэталёўцаў.

Тарнопаль: Праф. Саюз работнікаў па дзераву.

Цехановіцы: агульны сход Праф. Саюзу краўцоў.

Казімеж: работніцкі сход.

Калушын: агульны сход працаўнікоў „Іглы“.

Тарнов: агульны сход капялюшнікаў.

Паб‘яніцы: сабраньне тэкстыльшчыкаў.

Львоў: сход Праф. Саюзу працаўнікоў гандлю.

Сэмпольно: сход прац. „Іглы“.

Быхава: Праф. Саюз гарбароў.

Плонск: канфэрэнцыя Праф. Саюзаў работнікаў адзежнай прамысловасьці.

Ласк: канфэрэнцыя Праф. Саюзаў.

Кобрын: агульны сход Праф. Саюзу харчавікоў.

Пінск: агульны сход работнікаў фабрыкі сернікаў.

З жыцьця Горадні.

✕ **Выбары да касы хворых 21 лістапада не адбудуцца!** У Варшаве большасьць мандатаў атрымаў выбарны Камітэт „Работніцкага Аб‘яднаньня“, а ў нашым горадзе ён атрымаў-бы яшчэ балей, што навет сцьвярдзілі пэпэзсаўцы, хадэкі і т. п. на сваіх мітынгах. Дык вось гэныя партыі паднялі гвалт перад сваімі цэнтралямі, каб іх ратавалі, бо яны праваляцца. Навет пэпэзсаўскі закапершчык Ганэрко, ходзяць чуткі, меў канфэрэнцыю па гэтаму пытаньню з аднэй „мілай“ ўстановай ў Варшаве. У канцы канцоў выбары ў Касу Хворых адкладзены па загаду Варшавы, і няведама, калі адбудуцца. Але за гэты час, маема надзею, яшчэ больш будзе мець прыхільнікаў камітэт работніцкага аб‘яднаньня.

Молат.

✕ **„Мы доўга цярпелі, цярпець больш немагчыма!“**—гэткія словы выляцелі з вуст 146 работнікаў і работніц Серніковае фабрыкі 17 лістапада с. г.

Як ужо было напісана ў № 35, работнікі гэтае фабрыкі знаходзяцца ў кепскіх матэрыяльных варунках і ад даўна вядуць зацятую барацьбу за паляпшэньне іх.

Перабралі яны ўсе спосабы барацьбы, пасылалі прадстанікаў сэсіі у Варшаву, але ведаеце, як іх тамака сустрэлі, як нагляднa паказалі, за каго іх лічаць. Тады работнікі і работніцы зразумелі, што трэба і пара ўжо прымусіць капіталістаў лічыцца з імі, як з людзьмі. Дзеля гэтага яны яшчэ цясьней згуртаваліся. Супольная бяда і голад так цесна скавалі іх, што яны былі гатовыя на ўсё—навет на сьмерць. Дык вось 17 лістапада, а 12 гадзіне, калі фабрычны гудок апавясьцаў абедзены час,—работнікі, выставіўшы трэбаваньне падвышкі на дарагоўлю 15% для мужчын, а 20% для

грамадой у кантору дырэктара. Убачыўшы гэта, даверaная асоба „pana dyrektora“ выйшла з канторы і загарадзіла сабою ўваход у яе, кажучы, што ён ня пусьціць нікога ў кантору. Але работнікі з крыкамі: „проч, буржуазыйны паслугач! давай дарогу галодным работнікам! нам патрэба дырэктара!“ Пачалі націскаць на яго. „Пан дырэктар“, які за крывавую працу работнікаў купіў два маёнткі і дом у Бэрліне, пачуўшы небясьпеку, уцёк да сваe хаты і замкнуўся. Работнікі паглядзелі, што ў канторы дырэктара няма, дык пакіраваліся да яго кватэры. Падыйшоўшы да дзьвярэй, сталі ламатаць. Па „długich i ciężnich cierpieniach“ зьяўляецца ў дзьвярох яго жонка, якая апавясьціла, што „барын“ ляжыць у ложку хворы. Таўпа работнікаў пачала гудзець.—А „барын“ гэтым часам затэлефанаваў у паліцыю. Не прайшло і пару мінут, а паліцыя тут як тут! Ведама, што не абыйшлося без „Шэрлокаў Холмсаў“, — дый акружылі навакол фабрыку.

Переканаўшыся, што цяпер ніякае небясьпекі ўжо няма, выпаўз да работнікаў „пан дырэктар“ і пытаецца, што ім трэба? Работнікі, як адзін, адказалі: „ці-ж ты ня ведаеш, што нам трэба і пашто мы прышлі? то ты замест падвыжкі паліцыю нам даеш?! Вампір ты!“—Паліцыя, пачуўшы гэта, наставіла штыкі і стала крычаць, каб разыходзіліся. Работнікі ані з мейца нярушыліся толькі яшчэ галасьней заявілі, што датуль не разыдуцца, пакуль трэбаваньні іхнія ня будуць здаволены. „А як вам трэба, то можаце ісьці самі!“—тады паліцыя стала страшыць, што будзе арыштоўваць; але салідарныя работнікі заявілі ў адзін голас: „барджэй ляжам мы трупамі, чым дамо вам хаця .аднаго нашага работніка вывясьці за браму!“

Дырэктар, убачыўшы, што работнікі дружна стаяць адзін за аднага, аб‘явіў, што дае ім 5% пакуль-што, а заўтра паездзе ў Варшаву, бо адзін ня можа гэтае справы вырашыць. Хімічныя работнікі паказалі нагляднa, што ў яднаньні—сіла, што, стоячы адзін за аднаго і адзін за ўсіх, яны перамогуць.

Карэспандэнцыі.

Дарэмныя пастрахі.

(В. Каты. Беніцкай гм. Маладачанскага пав.).

Пачулі нашы ворагі моц Грамады. Баяцца, і дрыжаць у іх лыдкі перад стыхійным ростам народнага адраджэньня ў глухіх кутках Беларусі. Чуючы сваё бяссільле перашкодзіць народнаму руху, дык прыбягаюць да апошняга срэдзтва — запалохваць сялян будучымі рэпрэсіямі, хто ўступіць у Грамаду.

Так надовячы Хлябовіч—„пан над дробнай бульбай“—пры спатканьні з сябрам Грамады з Зарудзіч страшыў патопам, страшным судом на тым сьвеце за грамадзкую працу, ды казаў, што і на Лукішкі недалёка.

Дзякуем „даражэнькаму“ падхлебніку панскаму (бо купіў панскай 40 дзес. зямлі) за пастрахі. Не баімося мы Лукішак, бо праца наша законная і карысная. А табе, „дзядзька“, радзім лезьці на печ і не паказываць носа. Манна сама табе пасыплецца з неба...

„Катоўскі“.

Самаўпраўства.

(М. Лунна, пав. Градзенскі).

У ліпні с. г., тутэйшы пастух перапраўляў паромам жывёлу церaз Неман на пасьвішча. У гэты час пад‘ехаў да перапpaвы вядомы на ўсю ваколіцу сваімі хуліганскімі выбрыкамі абшарнік (праўда, дробны) з Гудзевіч, Уладзімір Міклашэвіч, які патрэбаваў, каб пастух ня гнаў жывёлу на паром, пакуль ён, Міклашэвіч, не пераедзе на другі бок. Пастух не зьвярнуўшы ўвагі на гэты загад, рабіў сваё далей. Тады Міклашэвіч схапіў пастуха і ўкінуў яго ў Неман так, што бедны хлапец утапіўсяб, каб яго ня выратавалі быўшыя на пароме людзі. Аб гэтым была зроблена заява паліцыі, якая пры павароце Міклашэвіча рабіла дазнаньне, але справа гэтая чамусьці заглохла. Ня ўжо-ж падобнае хуліганства Міклашэвіча застанецца непакараным? Пэўне-ж, каб гэтак зрабіў не Міклашэвіч, з пастухом, а наадварот, дык вынікі былі-б зусім іншыя... Вось і гаворы пасьля гэтага аб роўнасьці ўсіх перад законам!

Кавіч.

Нам пішуць з вёскі што:

× 18 Лістапада г.г. Акружны Суд у Слоніме разглядаў справу Аляксандра Багданчука і Эдварда Шаруцкага, абвінавачаных па 129 арт. К.К. Прыгаворам Суда Шаруцкі апраўданы, а Багданчук засуджаны на 1 год крэпасьці з залічэньнем 10 месяцаў сьледчага вастрогу.

× Нехта на гэтых днях вывесіў ў м. Маладэчыне чырвоны штандар. Арыштавалі за гэта 20.XI жыхара Маладэчына Янку Наваша. Якая падстава? А проста зусім: адзін крамнік паказаў у паліцыі, што аднаго разу неяк купляў у яго Янка Наваш чырвоны паркаль.

× Калі ўзышла карова Паўла Бобрыка на зямлю пана Мароза з двара Марышкі, Гарадоцкае гм., Маладэчанск. пав., то пан схапіў стрэльбу і хацеў застрэліць карову і Бобрыка.

× Каб папасьці ў войты, Мірон Лебедзь, Ставецкай гм., Пінскага пав., абяцаў сялям, што ня будзе ганяць сялян папраўляць панскую грэблю, паможа здабываць беларускія школы, беларускія газэты будзе акуратна аддаваць і г. д. А цяпер, як стаўся войтам, якраз робіць наадварот. Пра беларускія газэты кажа, што староста загадаў беларускія газэты адсылаць у староства, а сам гэтыя газэты ў кішані носіць.

Ад рэдакцыі. Гэтую справу мы скіравалі ў Сойм. Кл. Бел. С. — Р. Грамады.

× Поп Кругавіцкай парахвіі Лунінецкага пав. Васіль Давідовіч за хрышчэньне бярэ 5 зл., за вянец 60 зл. А як памёр малады хлапец, пакінуўшы бяз гроша пяць сясьцёр і 90 гадовую бабку, то за вынас з хаты пакойніка гэты поп зажадаў 12 зл. Ногі яму цалавалі, каб уступіў,—дык ня ўступіў. Бедныя ездзяць вянчацца да ксяндза.

× Сяляне в. Старое Запалае, Глыбоцкай гм., Дзісенскага пав.—па 6 зл. ад штукі заплацілі лясьніцтву за пашу кароў у лесе. А вось надлесны Казімер Піскуновіч выгнаў быдла з лесу, абазваў пастуха бандытам-камуністам і моцна зьбіў. Гэты Піскуновіч жыцьця не дае сялянам.

× Сялянскай жывіне і ступіць ня можна на абшарніцкую зямлю, бо вось як паны разлічваюцца за гэта. 20.X с.г. сьвіньня Язэпа Каўтуневіча з в. Аброва, Свята-вольскай гм., Касаўскага пав. узыйшла на гару не далёка ад двара Аброва п. Дзюрлікоўскага, дык панскія лякаі Сьцяпан Навасельскі і Бнеўскі злавілі яе і, зьвязаўшы завалаклі ў двор. А пайшоў селянін па сьвіньню, то Бнеўскі пабіў яго па твару.

Ад рэдакцыі. За гэткія справы трэба падаваць на суд.

× „Вывядовчыні“ Аміля Патаповіч з в. Выганічы, Ракаўскай гм., Маладэчанскага пав., улезла ў клець хлапцоў Сабанеўскіх. Тыя злавілі злодзея і на суд; дык цяпер гэтая зладзейка прыклеіла Сабанеўскяму шпіёнаж, і цягаюць небараку па розных „urzędach śledczych“, Брэша яна і на „Грамаду“, ды посьпеху ня мае.

× Каля в. Гічыцы, Борка-Гічыцкай гм., Касаўскага пав., Віл. Дырэк. Дзярж. Чыгунак праводзіць вузкую калейку. Падрадчык вызначыў мужчыне ў дзень толькі 2 зл. 50 гр. Рабочыя забаставалі і, нягледзячы на правакацыю Якуба Уласоўца і Азіка, трымаліся дружна і дабіліся падвышэньня заробку.

× 14.X г.г. у в. Масаляны, В. Есьмонтоўскай гм. Горадзенскага пав., прыехаў войт Кулікоўскі з пісарчуком Стаськам і паліцыянтам забіраць сялянскае дабро за падаткі. Сяляне перапужаліся і пачалі хаваць — хто што меў; але войт, выпіўшы і закусіўшы ў солтыса Ціта Сака, толькі перапісаў рэчы і сказаў, што, калі да нядзелі не аддадуць грошай, то прыедзе прадаваць тое, што запісаў. А солтыс Ціт Сак кажа войту, што сяляне маюць грошы, але гурток не пазваляе плаціць!

На брахню Ціта войт нічога не адказаў.

× Пратакол за сабак сялян з хлеба зьвялі, а вось што робіць паліцыя. Сабака-ваўчок каманданта паліцыі ў Едах, Браслаўскага пав., душыць жывёлу і калечыць людзей. Гэты сабака ў сьв. Міхаіла ў Едах загрыз гуся і жарабя загнаў на калючы дрот; дык сьвяшчэньнік і старосьце Браслаўскаму пажаліўся, — але ўсё роўна нічога!

× Войт Дакудаўскай гм., Лідзкага пав., па паходжаньню селянін, а цяпер задаецца панам. Прыйдзе да яго селянін, дык ён сьпіць—кажа: „Як высплюся, тады прыйдзі“. А прыйдзе, — то, калі інтарэсант з бутэлькай, то добра, а — не, дык „заўтра—кажа—прыйдзі“. За падаткі апошнія рэчы забірае, як гэта было з бедным вучыцелем Дзям‘янам Ройшай з в. Карэмілкаў: апошнюю сетку, што рыбу лавіць, — забраў войт. Зямлі толькі адну дзесяціну мае гэты вучыцель, службы не даюць, — бывала хоць рыбы зловіць для дзяцей, а цяпер што будзе рабіць?!

× Удава Агата Марцуль з в. Плюскалаўцы, Вяліка-Берастaвіцкай гм., Гродзенскага пав., узяла ў Якуба Дудкі з в. Канчане на пашу жарабя — за плату 8 пуд. жыта. І вось Дудка не заплаціў, але прыйшоў з паліцыянтам Косманам, і паліцыянт забраў жарабя бяз платы.

Ад рэдакцыі. Гэную справу перадалі мы ў Сойм. Кл. Б. С. — Р. Грамады.

× У в. Ахова, Жабчыцкае гм., Пінскага пав., у 1923 г. адабралі царкву, перавярнуўшы яе на касьцёл. У гэтым годзе была эпідэмія водры, — дзеці мярлі, як мухі, — а ксёндз Малашэўскі не пазваляў хаваць дзяцей на магілках, бо дзеці праваслаўныя, — а там дзяды і прадзеды іх ляжаць. Але сяляне ня слухалі, — хавалі, дык панапісваў ксёндз пратаколы, на „непаслушных“. А пасьля сялянам казаў: „Хто дзень мне паробіць, таго пратаколу не падам у суд“. Некаторыя й рабілі! Гэты ксёндз праваслаўных вянчаў дарма, а пасьля праз гміну прышло плаціць па 20 зл.

Ад рэдакцыі. Гэтую справу мы перадалі ў Сойм. Кл. Б. С. — Р. Грамады.

× 27.IX г. г. у Навагрaдку былі заарыштованы і адпраўлены ў палітычную паліцыю пяць грамадзістаў на чале з Вас. Раманюком. Абвінавачвалі іх у „публічным распаўсюджваньні літэратуры Бел. С. — Р. Грамады“. Збадаўшы, арыштаваных тут жа звольнілі.

× Альгэрд Гейштофт, абшарнік з двора Паручын, Гараддзцкай гм., Баранавіц. пав., судамі за сэрвітут з гаспадарак пазводзіў сялян в. Крывое Сяло. А цяпер зрабіў ён сабе дарогу на полі беднага селяніна Яз. Шумскага і езьдзьзіць, а селянін і 10 зл. ня мае, каб падаць пана на суд.

Не грамадзіст той, хто не падасьць дэклярацыі на беларускую школу!

Змаганьне за родную школу.

Да ведама сяброў і гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

1. Сябры і гурткі з Навагрaдзкага і Дзісьненскага паветаў у-ва ўсіх справах: залічэньня ў сябры, выдачы білетаў, узносу сяброўскіх складак, паведамленьня старасты аб сходзе і выбару Управы гурткоў, легалізацыі бібліотэк-чытальняў і г. д.—павінны зьвяртацца да сваіх Акружных Управаў: 1) у Навагрaдку па адрасу: m. Nowogródek, Wielki Rynek № 37, 2) у Глыбокім па адрасу: m. Głębokie, ul. Warszawska № 69.

Уся перапіска з гэтых паветаў, якая будзе прыслана у Галоўную Управу, будзе зараз-жа адаслана ў Акружныя Управы для выкананьня.

2. З гэтых паветаў у Галоўную Управу беспасрэдня трэба скіроўваць толькі перапіску аб надужыцьцях войтаў ды іншых агентаў, якія будуць перашкаджаць у культурна-асьветнай працы.

3. Некаторым сябром і гуртком Т-ва затрымлена высылка сяброўскіх білетаў і паведамленьняў старасьце дзеля незалежных ад Галоўнае Управы прычын. У хуткім часе ўсё будзе выслана.

Галоўная Управа.

Скарбонкі Таварыства Беларускае Школы.

На просьбу Галоўнае Управы Міністар Унутраных Спраў рэскрыптам ад 18 кастрычніка 1926 г. за № IV. А. Р. 7235/26 дазволіў сябрам Таварыства Беларускае Школы зьбіраць ахвяры на карысьць Таварыства у скарбонкі ў сваіх хатах.

Ніжэй падаем одпіс рэскрыпту:

Wileński
Urząd Wojewódzki
Wydział Bezpieczeństwa
Dnia 6 XI 1926 r.
Z. V-11129.

Do Zarządu Towarzystwa Szkoły
Białoruskiej w Wilnie
ul. Wileńska 12

Niniejszym zawiadamiam, iż Ministerstwo Spraw Wewnętrznych reskryptem z dnia 18 października 1926 r. Nr. IV. AP. 7235/26 zezwoliło Zarządowi Towarzystwa na umieszczenie skarbonek w mieszkaniach prywatnych członków Towarzystwa bez specjalnego pozwolenia władz administracyjnych, pod warunkiem że skarbonki te będą umieszczane tylko w tych lokalach i że zbieranie do nich ofiar nie będzie miało żadnych cech kwesty publicznej.

Wyjaśniam, iż za mieszkania prywatne uważane być mogą tylko te mieszkania, w których wyżej wymienione osoby mieszkają i gdzie publiczność niema dostępu.

O ile skarbonki miały być również umieszczane w lokalach publicznych, szkołach, sklepach, biurach i t. p. Zarząd Towarzystwa winien uzyskać na to pozwolenie od właściwej władzy na zwykłych warunkach.

Za Wojewodę
Kierownik Oddziału (подпіс ня выразны)

На падставе гэтага распараджэньня кожны сябра Т-ва мае права, бяз ніякага дазволу вывесіць у тым памешканьні, дзе ён жывець, скарбонку і складаць да яе грашовыя ахвяры на карысьць асьветы свайго народу.

З гэтаю скарбонкаю ён ня мае права зьбіраць ахвяры на вуліцы, у крамах і наагул па за сьценамі свайго прыватнага памешканьня.

Калі б хто з сябраў Т-ва ці якая арганізацыя Т-ва хацелі вывесіць скарбонку ў памешканьні, куды мае даступ публіка, як напрыклад: у школах, гмінах, крамах, канцэлярыях, тэатрах, каапэратывах, сэкрэтарыятах, Управах Гуртка, бібліотэках-чытальнях, Народных дамох і г. д., то тады аб гэтым трэба прасіць дазволу ад старосты.

Да сяброў-жа Т-ва Галоўная Управа зьвяртаецца з асаблівым заклікам на як шырэйшае распаўсюджваньне вывешываньня скарбонак у прыватных сваіх памешканьнях.

Маючы на мэце гэткае высокае заданьне, як пашырэньне асьветы і культуры сярод нашага беларускага народу, няхай кожны сябра Т-ва, пачуваючы сябе сынам сваей Бацькаўшчыны, мае ў сябе ў дома скарбонку, да якое зложыць свае хоць-бы невялікую ахвяру. **Галоўная Управа.**

УВАГА. Тасуючы рэпрэсіі ў справе беларускага адраджэньня, Пінскі староста не прамінуў і такое нявіннае працы, як зьбіраньне сябрамі Таварыства Беларускае Школы ахвяр на карысьць асьветы ў скарбонкі Т-ва.

Ен загадаў сканфіскаваць скарбонкі ў сяброў Таварыства Мікалая Багно, Тодара Сахварука. Суд прысудзіў яка-бы за нелегальнае трыманьне скарбонак Мікалая Багно на 15 зл. 50 гр. штрафу або 3 дні адседкі, а Мікалая Малайчука таксама на 15 зл. 50 гр. або 3 дні адседкі за тое, што прывёз скарбонкі і даў другім сябром.

Не ўзабаве ў гэтай самай справе засудзілі яшчэ Тодара Сахварука і Мікалая Малайчука па 5 злотых штрафу або 3 дні адседкі.

Адчуваючы сябе нявіннымі засуджаныя падалі апэляцыю ў Акружны Суд.

Пасьля апублікаваньня дазволу Міністра Акружны Суд мусіць апраўдаць пакрыўджаных.

Трэба адзначыць, што дазвол Міністра ад 18 кастрычніка гэтага году праз Віленскае Ваяводзтва атрыманы толькі 7. XI. г. г.

З Радавае Беларусі.

17.405.000 руб. крэдыту для сельскай гаспадаркі.

Грашова-бюджэтная сэкцыя Дзярж. Плян. Каміс. зацьвердзіла плян крэдытаваньня сельскай гаспадаркі праз Белсельбанк і таварыствы с.-г. крэдыту на 1926—1927 год у суме 17.405.000 руб. Доўгатэрміновых крэдытаў будзе 56,1 процантаў, рэшта—каротка-тэрміновыя.

Павялічэньні заработнае платы.

Савет Народных Камісараў БСРР прыняў пастанову аб павялічэньні ў 1926—27 апэрац. годзе зарабстнай платы між іншым наступных галін прамысловасьці:

1) шкляная прамысловась—павялічэньне на 7 проц.; 2) па апрац. дрэва—на 5 проц.; 3) хімічная прамысловасьць—на 12 проц.; 4) харчовая — на 6 проц.; 5) тытуновая — на 7 проц.; 6) папяровая—на 7 проц.; 7) ільна-прадзільная—на 10 проц.; 8) па акулярнай прамысловасьці — на 5 проц.

Стан каапэрацыі ў БССР.

На 9-ю гадавіну Кастрычнікавай Рэвалюцыі сетка спажывецкай каапэрацыі БСРР налічвае: 546 спажывецкіх таварыстваў з 1518 крамамі ў сельскіх мясцовасьцях, прычым на кожнае спажывецкае т-ва прыходзіцца 2014 кв. кілёмэтр., 1278 сялянскіх гаспадарак і 7020 душ насяленьня. Пайшчыкаў усяго—250.775, у сярэднім 460 чал. на арганізацыю; каапэравана 34 проц. сял. гаспадарак; паявых капіталаў—461.825 руб.

Рабочая сетка складаецца з 13 цэрабкопаў, якія маюць 334 магазынаў і ларкоў; пайшчыкаў 74.058 чал., каапэравана 66,1 проц. членаў праф саюзаў; паявы капітал—259.000 руб.

На чале ўсёй сыстэмы спаж. каапэрацыі стаіць цэнтральная арганізацыя — Белкаапсаюз, які для абслугоўваньня сыстэмы ў гандлёвых адносінах мае канторы ў Маскве, Ленінградзе і на Украіне. Звароты Белкаапсаюзу з 7.707.000 руб. у 1924—25 г. павялічыліся да 29.696.000 руб. у 1925—26 г., г. зн. на 385 проц.

Фінансавае палажэньне сеткі, за выключэньнем асобных арганізацый, зусім устойчывае. На жаль, агульныя лічбы, паданыя тут, яшчэ лішне малыя, каб правільна абслужываць увесь абшар Радавае Беларусі. Дык павінны быць зроблены спэцыяльныя захады дзеля разьвіцьця і пашыньня каапэрацыі ў БСРР: яна-ж замяняе сабой дасюляшнія ўслугі прыватных гандляроў!..

Лекцыі аб беларускай літэратуры па радыё.

Менская шырока-вяшчальная станцыя наладжвае па радыё лекцыі аб сучаснай беларускай літэратуры (Я. Купала, Я. Колас, М. Чарот і інш.).

Лекцыі чытаюць працаўнікі І.Б.К.

Праца Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру.

Закончыла сваю працу ў Гомельшчыне Беларуская Дзярж. Вандроўная Трупа пад кіраўніцтвам Галубка.

Трупа абслужыла г. Рэчыцу, Гомель, Нова-Беліцу, Дабруш, Новазыбкаў і гор. Клінцы.

У працягу месяца было пастаўлена 23 спэктаклі і 5 канцэртаў. Спэктаклі былі або дармовыя, або платныя з таннымі білетамі (у сярэднім аб 15 да 50 кап.).

Рабочых і сялян было на спэктаклях звыш 15.000 чалавек, прычым рабочыя ўсюды выказвалі шчырую падзяку і добрыя водзывы аб пастаноўках.

З 5-га лістапада трупа распачала працу ў гор. Клімавічах, Калінінскае акругі.

Працу беларускае трупы ў Гомельшчыне трэба асабліва горача вітаць, бо-ж Гомельшчына ўсё яшчэ не далучана да БСРР і астаецца неяк з боку ад агульна-беларускага культурнага жыцьця.

За варожыя адносіны да беларусізацыі.

Нацыянальная Камісія пры Менскім А.В.К. падняла пытаньне перад прэзыдыумам АВК аб звальненьні з пасады загадчыка гаспадарчай часткай Менскай электрастанцыі гр. Віхмана за варожыя адносіны на беларусізацыі.

Юрыдычныя парады.

Нагляднаму. Трэба зьвярнуцца ў суд. **Канцавому Рыгору.** Калі на сэрвітут маеце дакуманты, дык можна судзіцца, а калі не — лепей пагадзіцца **Яўхіновіч Маланьні.** Трэба, каб Ваша радня ў ССРР хлапатала там, каб пазволілі прыехаць. **Цярэшку Сьцяпану.** Страхавая плата не залежыць ад надзелу, а ад будынку.

Паштовая скрынка.

Кастусю Цікаваму. Карэсп. Ваша: „Абразок з нашага жыцьця“ ў газэту не падходзіць па свайму зьместу. **Блізкаму.** Ваша карэсп. бяз Вашага адрэсу і прозьвішча, — дык і не зьмяшчаем. **Ніціфароўскаму.** Атрымалі,—друкуем. **Помстнаму.** Вашай карэсп. не зьмяшчаем дзеля незалежных ад нас прычын.

Адказны Рэдактар: К. Вайтовіч. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.